**Ермаковіч К.А. (Мінск, Беларусь)**

## Аксіялагічны падыход да вывучэння беларускай літаратуры ваеннай тэматыкі ў X–XI класах (аглядавыя і манаграфічныя тэмы)

Вывучэнне аглядавых і манаграфічных тэм на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі з'яўляецца неад'емнай часткай літаратурнага адукацыйнага працэсу. Аглядавыя і манаграфічныя тэмы ствараюць умовы для дасягнення асноўнай мэты навучання літаратуры ў X–XI класах, г.зн. для фарміравання ў вучняў цэласнага ўяўлення пра беларускую літаратуру ў яе гісторыка-культурным развіцці. Разам з тым такія ўрокі спрыяюць не толькі паглыбленню ведаў вучняў, пашырэнню інфармацыі па гісторыі і тэорыі літаратуры, але і дапамагаюць выпрацаваць сістэму поглядаў, жыццёвых перакананняў і арыенціраў асобы. Таму важным бачыцца арганізацыя названых урокаў па вывучэнні твораў ваеннай тэматыкі на аснове аксіялагічнага падыходу.

Структурна курс беларускай літаратуры ў X–XI класах уключае ўрокі аглядавага і манаграфічнага вывучэння гісторыка-культурных і гісторыка-літаратурных звестак. Своеасаблівым прапедэўтычным этапам тут становіцца літаратурны адукацыйны працэс у IX класе, заснаваны на гісторыка-храналагічным прынцыпе, калі адбываецца знаёмства з творамі перыяду ўзнікнення мастацтва слова, з асаблівасцямі ўплыву антычнага мастацтва і літаратуры на сусветную культуру, калі вядзецца гутарка пра літаратуру эпохі сярэднявечча, эпохі Адраджэння, пра асаблівасці барока, класіцызму і асветніцтва ў беларускай літаратуры, засяроджваецца ўвага на адметнасцях новай беларускай літаратуры з такімі яе вядучымі накірункамі, як рамантызм, сентыменталізм, рэалізм, а завяршаецца курс шляхам развіцця беларускай літаратуры ў пачатку XX стагоддзя. Відавочна шырокі жанрава-тэматычны дыяпазон урокаў літаратуры ў IX класе спрыяе фарміраванню аналітычных здольнасцей вучняў, паглыбленню навыкаў іх самастойнай работы з дадатковымі крыніцамі, выпрацоўцы ўменняў выступаць з рэфератамі, паведамленнямі, прымаць удзел у дыспутах, канферэнцыях. Таму X–XI класы – гэта этап замацавання і ўдасканалення папярэдне набытых уменняў і навыкаў. На падставе вышэй адзначанага мэтазгодным бачыцца выпрацаваць такі сістэматычны алгарытм працы на ўроках, які стаў бы своеасаблівай мадэллю вывучэння аглядавых і манаграфічных тэм.

Літаратурны працэс на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі нельга разглядаць падчас вывучэння толькі манаграфічных тэм. Не з'яўляецца метадычна апраўданым і знаёмства з гісторыка-літаратурнымі паняццямі і працэсамі ў кантэксце вывучэння творчасці аднаго аўтара. У сувязі з вышэй адзначаным, абапіраючыся на асноўную мэту навучання беларускай літаратуры ў X–XI класах і ўлічваючы ўзроставыя магчымасці вучняў, нарматыўна-прававым забеспячэннем літаратурнай адукацыі прадугледжана аглядавае вывучэнне асобных перыядаў развіцця беларускай літаратуры.

Літаратурны адукацыйны працэс IX–XI класаў заснаваны на вывучэнні 16 аглядавых тэм, з якіх творам ваеннай тэматыкі адведзена па 2 гадзіны ў X і XI

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

класах. Звернем увагу на тое, што вывучэнне літаратуры перыяду Першай сусветнай вайны прапанавана толькі манаграфічна падчас знаёмства з творчасцю М. Гарэцкага ў X класе.

Асаблівасцю вывучэння твораў ваеннай тэматыкі на ўроках беларускай літаратуры з’яўляецца разуменне вучнямі шырыні зместавага дыяпазону тэмы “Чалавек і вайна”. Неабходна мець на ўвазе, што ў паняцце “творы ваеннай тэматыкі” ўключаюцца ўсе творы пра вайну як з’яву, напісаныя або падчас яе ходу, або ў пасляваенны перыяд.

Агульнапрызнана, што беларуская літаратура ў свеце стала вядома найперш творамі, прысвечанымі падзеям Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў. Таму аглядавае вывучэнне літаратуры 1941–1945 гадоў у X класе павінна грунтавацца на наступных асаблівасцях: перавага лірыкі, публіцыстыкі, сатыры, асасблівасцямі якіх было хуткае ўздзеянне на чалавека, лёгкае запамінанне твораў на слых; нешматлікія празаічныя творы (найперш апавяданні, фельетоны); дакументальнасць літаратуры; актыўнае ўжыванне рамантычных, лірычных і сатырычных элементаў, а таксама алегорый, сімвалаў, метафар.

Даследчык М.А. Тычына называе асноўныя паваротныя этапы ў развіцці беларускай прозы аб Вялікай Айчыннай вайне: “Гэта – час гераізацыі, калі пераважаў народны эпас (Я. Колас, К. Чорны, М. Лынькоў, І. Мележ, І. Шамякін, А. Кулакоўскі), час лірызацыі, калі на першы план выйшла аўтабіяграфічная проза (І. Шамякін, Я. Брыль, В. Быкаў, А. Адамовіч, І. Навуменка, А. Карпюк), час трагедызацыі, калі свій драматычны вопыт увасобіла ў мастацкіх творах пакаленне “дзяцей вайны” (І. Пташнікаў, В. Адамчык, І. Чыгрынаў, М. Стральцоў, В. Казько, А. Кудравец, В. Карамазаў). Асобнае ўнікальнае месца ў беларускай прозе займае мастацка-дакументальная проза, і найперш кніга-рэквіем “Я з вогненнай вёскі…” А. Адамовіча, Я. Брыля, У. Калесніка” [2, с. 220]. У прапанаваную класіфікацыю твораў пра вайну можна ўключаць не толькі прозу, але і лірычныя, драматычныя творы. Калі ж гаварыць пра асаблівасці адлюстравання вайны ў беларускай літаратуры ў цэлым, то схема-класіфікацыя будзе выглядаць наступным чынам: 1) рамантыка паводзін у ваенных абставінах; 2) гераізм; 3) бытапісальніцтва; 4) дакументальная дакладнасць; 5) ваенны драматызм і трагізм чалавечага існавання; 6) вайна як анамальная з’ява. На кожным з названых этапаў развіцця літаратуры ваеннай тэматыкі неабходна ўлічваць сістэму каштоўнасных адносін героя да навакольнага свету, да грамадства, да сябе.

Паколькі мастацтва слова ў час вайны не мае на мэце даць глыбокае асэнсаванне ваенных перыпетый, а наадварот заклікае да абароны бацькаўшчыны, імкнецца даць надзею, уздзейнічаць на людзей пры дапамозе лозунгавасці, мастацкай вобразнасці, паказаць гераізм салдатаў, быць запамінальнай і даступнай (маецца на ўвазе запамінанне тэкстаў на памяць, перадача іх іншым, тыя ўмовы, калі няма як удумліва пачытаць), то на першы план, зразумела, выходзіць публіцыстыка і паэзія. Пісьменнік, які быў непасрэдным удзельнікам вайны, па-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

мастацку асэнсоўваў яе пасля заканчэння (М. Гарэцкі, Я. Брыль, В. Быкаў, А. Адамовіч і інш.).

Паўнавартаснае вывучэнне твораў ваеннай тэматыкі адбудзецца пры ўмове правільнага суаднясення матэрыялу аглядавай тэмы з тэмамі манаграфічнымі, якія ў праграме пададзены ў адным раздзеле. Даследчык У.М. Філіповіч акцэнтуе ўвагу на тым, што каардынацыя тэм павінна адбывацца наступным чынам. Вывучэнне літаратуры кожнага гістарычнага перыяду павінна пачынацца аглядавай тэмай, паколькі мэта яе – пазнаёміць вучняў з пэўным перыядам. Затым неабходна разгледзець манаграфічныя тэмы, г.зн. вывучыць творчасць тых пісьменнікаў, якія з’яўляюцца найбольш яркімі прадстаўнікамі аналізуемага часу. Затым зноў звярнуцца да аглядавай тэмы. Аўтар дадзенай методыкі перакананы, што такая форма работы паспрыяе найбольш поўнаму і свядомаму засваенню агульнай характарыстыкі літаратурнага руху вывучаемага перыяду [3, с. 10].

З другога боку, як адзначае Я.В. Кваткоўскі, раней манаграфічныя тэмы абапіраліся на гісторыка-літаратурныя агляды. Яны з’яўляліся канкрэтызацыяй агульных палажэнняў, сфармуляваных у гэтых аглядах. Аглядавая ж тэма сістэматызуе і абагульняе важнейшыя гісторыка- і тэарэтыка-літаратурныя звесткі, набытыя падчас вывучэння тэм па творчасці асобных пісьменнікаў [1, с. 5].

Вывучэнне літаратуры ваеннай тэматыкі, на нашу думку, павінна адбывацца на аснове абавязковага ўліку эканамічнага, палітычнага і культурна-гсітарычнага развіцця грамадства. Знаёмства з біяграфічнымі звесткамі аўтара павінна быць суаднесена з тымі грамадскімі абставінамі, у якіх даводзілася працаваць пісьменніку. Таму мэтазгодным будзе пачынаць пэўны раздзел з аглядавай тэмы, манаграфічныя тэмы суправаджаць гісторыка-літаратурнымі звесткамі, а падвядзенне вынікаў, асаблівасцей развіцця літаратуры ў акрэслены перыяд зрабіць у форме агляду. Прычым на апошнім этапе вучні павінны быць актыўнымі арганізатарамі ўрока, на якім настаўнік выступае ў ролі мадэратара.

Многія метадысты прапануюць пры вывучэнні аглядавых тэм па літаратуры выкарыстоўваць форму лекцыі. На наш погляд, гэта не зусім мэтазгодна. Для таго, каб зразумець асаблівасці літаратурнага працэсу ў час сусветных войнаў, усвядоміць ролю ў ім пісьменніка, вызначыць жыццёвыя погляды і каштоўнасныя прыярытэты тагачаснага грамадства праз вобразы герояў, важным бачыцца факт асабістага далучэння вучняў да лёсу народа. Істотнымі з’яўляюцца тыя мастацкія вобразы, якія вядуць да эмацыйнага ўспрыняцця, вобразнай перажытасці матэрыялу. Так, уводзінамі да ўрокаў па вывучэнні літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны можа стаць слова настаўніка, **невялікі** лекцыйны фрагмент. Аднак асноўная задача павінна быць скіравана на псіхалагічную далучанасць да матэрыялу. Што можа яе забяспечыць? Нехта згадае гісторыю свайго роду, нехта ўспомніць звесткі пра салдат, пахаваных у сваёй мясцовасці, а нехта звернецца да мастацкай літаратуры. Тэму можна “здрабніць”, як таго патрабуе праграма, г.зн. што вучні робяць невялікія паведамленні па наступных, напрыклад, праблемах: 1. Паказ суровай праўды вайны. 2. Асуджэнне здрады Радзіме. 3. Трагедыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

чалавека на вайне. Падача матэрыялу павінна адбывацца на канкрэтных прыкладах (такімі могуць стаць сваякі, знаёмыя, літаратурныя героі). Калі ўрок будзе пабудаваны з "украпленнямі" з жыцця сям'і, з біяграфіі пісьменніка, цытатамі з мастацкіх твораў, то падача матэрыялу, форма работы на ўроку дазволіць вучням наблізіцца да асэнсавання трагічных старонак нашай гісторыі, да бачання асаблівасцей літаратурнага працэсу ў скрушных абставінах вайны. Тады стане больш зразумела, чаму, напрыклад, у творчай спадчыне Якуба Коласа не шмат увагі надаецца асэнсаванню падзей Першай сусветнай вайны: ён не быў ёю "паранены". Затое "раненне" гэтае пісьменнік атрымаў у час Вялікай Айчыннай вайны, калі страціў сына Юрку, на сабе адчуў боль і страх вайны.

Для вучняў XXI стагоддзя тэма Вялікай Айчыннай вайны стала тэмай гістарычнага мінулага. Вельмі важна акрэсліць час і ваенныя абставіны, у якіх апынулася Беларусь і беларусы ў 1941–1945 гадах. Таму важным структурным элементам урока па вывучэнні аглядавай тэмы з'яўляецца этап стварэння эмацыйнага настрою. Так, урок па тэме "Беларуская літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны" можна пачаць з праслухоўвання аўдыязапісу голасу Б. Левітана аб пачатку вайны 22 чэрвеня 1941 года, а на этапе падвядзення вынікаў урока ўключыць аўдыязапіс аб'явы аб капітуляцыі Германіі. Да месца могуць быць выкарыстаны жывапісныя палотны беларускіх мастакоў. Такая форма работы паспрыяе выпрацоўцы адпаведнай настроенасці на вывучэнне літаратуры пра вайну.

У выніку вывучэння аглядавых і манаграфічных тэм па літаратуры ваеннай тэматыкі ў вучняў павінны быць сфарміраваны веды аб асаблівасцях развіцця паэзіі, прозы і драматургіі ў перыяды Вялікай Айчыннай вайны і пасля яе заканчэння; аб спецыфіцы мастацкага адлюстравання вайны ў беларускай літаратуры; аб адлюстраванні трагедыі чалавека на вайне; аб каштоўнасных арыенцірах і прыярытэтах герояў твораў ваеннай тэматыкі.

Літаратура

1. Квятковский, Е. В. Изучение обзорных тем по советской литературе в десятом классе / Е. В. Квятковский. – М. : Изд-во Акад. пед. наук РСФСР, 1955. – 93 с.
2. Тычына, М. А. Чалавечае вымярэнне ў сучаснай беларускай ваеннай прозе / М. А. Тычына // Великая Отечественная война в судьбе литературы и культуры: исторический опыт как мировоззренческий и моральный выбор / ред.-сост. И. Н. Афанасьев. – Мозырь, 2011. – С. 220–232.
3. Филиппович, Н. В. Изучение обзорных тем в школьном курсе литературы XIX века : пособ. для учителей / Н. В. Филиппович. – М. : Учпедгиз, 1958. – 128 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ